# ЖЫЦЦЁ ПОБАЧ СА СВЯТЫНЯЙ

Слонім 2017

Змест

Уводзіны ……………………………………………………………………3
І.Асноўная частка…………………………………………………………6
1.1 Узнікненне і ўзаемаразвіццё вёскі і культавых
пабудоў……………………….........................................................................6
1.2 Царква Раства Прасвятой Багародзіцы – культурна-гістарычная
каштоўнасць……………………………………………………………...13
1.3 Уплыў Святыні на жыхароў
вёскі…………………………………………………………………………16
Заключэнне…………………………………………………………………20
Спіс выкарыстаных крыніц …..…………………………………………...21
Дадатакі……………………………………………………………………..22

“Святая царква быццам бы любячая маці, бярэ кожнага з нас за руку, вядзе па тым шляху, па якім чалавек абавязкова знаходзіць сябе ў самым высокім сэнсе, знаходзіць далучаснасць да быцця Божага глыбіні сваёй сутнасці”.

Епіскап Арцемій (Кішчанка).

## Уводзіны

Словы, якія мы ўзялі за эпіграф, як нельга лепш, раскрываюць сутнасць нашай работы. Ці ёсць чалавек, якога б не ўзрушылі купалы храмаў, тым больш мясцовыя? Ці застаецца хто абыякавым, ступіўшы пад скляпенні, дзе з абразоў глядзяць на цябе вочы святых праведнікаў?

Наша Беларусь – краіна даўняй і багатай праваслаўнай культуры.

Сёння храмы вяртаюць сваю спрадвечную гістарычную і грамадскую сутнасць, становяцца сапраўднымі цэнтрамі духоўнасці і культуры, уздымаюць людзей над будзённасцю. Хай не ўсе людзі свята вераць у Бога, не ўсе ходзяць у царкву, але і іх духоўнае жыццё ўзбагачаецца і накладваецца адбітак на маральны стан грамадства.

Вучні нашай школы прынялі рашэнне ўдзельнічаць у конкурсе «Лучший туристический маршрут по Слонимскому району «Родная Слонимщина». Вялікую цікавасць у нас выклікала тэматыка маршрутаў. Але больш за ўсё нашу ўвагу прыцягнуў турыстычны маршрут па рэлігійных аб’ектах раёна «Святыні Слонімшчыны».

Пачалася работа па вывучэнні аб’ектаў нашага будучага маршрута. Тут надышоў час пісаць навукова-даследчую работу. А ў нас столькі назбіралася цікавага матэрыялу, што не падзяліцца сваімі даследаваннямі было б проста недаравальна. Так мы ўзяліся за навукова-даследчую работу “Жыццё побач са Святыняй”, у аснову якой былі пакладзены звесткі з асабістага архіва Лабар Г.І., дыпломнай работы Барбажынскага Л.А., настаяцеля Пераналоцкага прыхода, інтэрв’ю са святарамі а.Дзмітрыем (Сёмухай) і а.Мікалаем (Шчаюком).

**Гіпотэза:** калі на самой справе вясковае жыццё побач з духоўным пачаткам – Святой царквой – станоўча ўплывае на маральны воблік людзей увогуле і падрастаючага пакалення ў прыватнасці, то гэтаму існуюць важкія доказы.

**Аб’ект даследавання:** царква Раства Прасвятай Багародзіцы і царква ў гонар іконы “Жываносная крыніца”.

**Прадмет даследавання:** уплыў Святынь вёскі Міжэвічы – царквы Раства Прасвятай Багародзіцы і царквы ў гонар іконы “Жываносная крыніца” – на мясцовае насельніцтва.

**Мэта:** паказаць уплыў храмаў на духоўнае развіццё мясцовага насельніцтва і маладога пакалення ў тым ліку.

**Задачы:**

вывучыць і прааналізаваць усе даступныя матэрыялы, якія тычацца абранай тэмы;

распрацаваць і арганізаваць пошукава-даследчыя мерапрыемствы;

уцягнуць у дзейнасць па зборы матэрыялаў для падрыхтоўкі напісання навукова-даследчай работы і састаўлення турыстычнага маршрута як мага больш вучняў;

выклікаць у школьнікаў цікавасць да гісторыі роднага краю, што непазбежна павінна прывесці да ўзнікнення і развіцця патрыятычных пачуццяў і грамадзянскай адказнасці;

выхоўваць паважлівыя адносіны да культурнай і гістарычнай спадчыны.

**Метады даследавання:**

супрацоўніцтва;
пошук;
збор інфармацыі;
адбор інфармацыі;
аналіз;
абагульненне;
сустрэчы і гутаркі;
анкетаванне;
інтэрв’юіраванне.

**Актуальнасць.** Выхаваўчая і навуковая значнасць вынікаў відавочная: праца над праблемай будзе садзейнічаць фарміраванню паважлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны, выхаванню ашчадных адносін да народнай памяці, пашырэнню цікавасці да мінулага, выхаванню грамадзяніна-патрыёта, развіццю творчай ініцыятывы, жадання ажыццяўляць пошукавую работу, імкнення дабівацца гістарычнай праўды.

Наш час вядомы не лепшымі сваімі праяўленнямі. Такія хібы нашага жыцця, як злачыннасць featureзнага кшталту, алкагалізм, наркаманія вядуць да дэградацыі грамадства – страце агульначалавечых маральных прынцыпаў, а ў канечным выніку – да знікнення нацыі. Так, мясцовым “помнікам” красамоўнага праяўлення вышэйсказанага можа служыць пашкоджаны

знак, які ўказвае на гісторыка-культурную каштоўнасць селішча перыяду жалезнага веку (Дадатак 1).

Гэтым з’явам павінна быць супрацьстаянне, адным з фактараў якога заўсёды была царква.

Надзённай праблемай з’яўляецца катастрафічнае зніжэнне цікавасці асобы да грамадскага жыцця. Лад жыцця становіцца ўсё больш адасобленым. Нам бачыцца, што гэту праблему лепш за ўсё пачаць вырашаць праз абуджэнне цікавасці да сваёй гісторыі і культурнай спадчыны. І, канешне ж, пачынаць трэба са сваёй малой радзімы, таму што, перш за ўсё, можа выклікаць цікавасць тое, што побач. Каштоўным з’яўляецца і тое, што ёсць магчымасць уцягнуць у супрацоўніцтва дарослых, бацькоў.

Разрыў сувязяў паміж пакаленнямі, аддаленне дзяцей ад бацькоў – яшчэ адна з праблем нашага грамадства. Цікава, што адзін са спосабаў яе вырашэння знайшоўся сам па сабе. Сумесная цікавая дзейнасць лягчэй за ўсё можа аб’яднаць людзей самых розных узростаў, выклікаць увагу і павагу адзін да аднаго. У нашым выпадку – гэта запаўненне анкет, гутаркі, успаміны і г.д.

## Асноўная частка

### 1.1. Узнікненне і ўзаемаразвіццё вёскі і культавых пабудоў

Наша вёсачка мае назву Міжэвічы. Авеяная сівымі легендамі, яна кліча нас з далячынь стагоддзяў, каб мы распавядалі пра яе, каб голас наш, як чароўная жалейка, напомніў, што яна жывая, што яна заўсёды чакае сваіх дзяцей, раскіданых па свеце, пад сваё цёплае крыло.

Як сведчаць археалагічныя раскопкі, на месцы вёскі існавала селішча перыяду жалезнага веку ранняга сярэднявечча VI – VIII стст. На гэтым месцы ўстаноўлены памятны знак, які ўказвае на тое, што гэта гісторыка-культурная каштоўнасць ахоўваецца дзяржавай [1].

За шматвякавую гісторыю вёскі многа слаўных людзей жыло ў Міжэвічах. Адрозніваліся яны паміж сабой нацыянальнасцю, рысамі характару, аднак аб’ядноўвае іх адно – добрая памяць аднавяскоўцаў і праваслаўная вера.

Пасля хрышчэння нашых зямель мяняўся ўклад жыцця, погляды і ўяўленні людзей. Усведамленне веры ў адзінага “Творцу Неба і Зямлі” дапамагала людзям выжываць і працягваць сваё існаванне ў складаныя часы гісторыі.

З 1556 па 1794 гг. вёска Міжэвічы знаходзілася ў пажыццёвым уладанні роду Нарбутаў. Потым вёска была канфіскавана на карысць казны.

Пасля падпісання Люблінскай уніі (1569 г.) наша вёска, як дробная частка ВКЛ, увайшла ў склад Рэчы Паспалітай. Пачынаўся новы этап суіснавання рэлігійных поглядаў жыхароў ВКЛ.

Як вядома, распаўсюджваўся значны ўціск на праваслаўе, але ж, да годнасці жыхароў вёскі, яны працягвалі захоўваць веру сваіх бацькоў.

Віхуры барацьбы за ўладу, за тэрыторыю праносіліся і над нашай вёскай. Аднак непахісная вера ў Бога давала свой плён: жыццё працягвалася, вёска не сыходзіла ў нябыт. І вось наступіла XVIII ст. Як вядома з гісторыі Рэчы Паспалітай, гэта магутнае дзяржаўнае ўтварэнне ўсё больш і больш слабела, губляла свае векавыя набыткі і пазіцыі.

У другой палове XVIII ст. адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай. У выніку трэцяга падзелу ў 1795 г. вёска Міжэвічы, як і тэрыторыя Заходняй Беларусі, апынулася ў складзе Расійскай імперыі, што потым наклала новы адбітак на жыццё тагачаснага люду.

Вось з таго часу, гэта значыць з 1795 г., пачынаецца прадгісторыя храма ў в. Міжэвічы.

Крыніцай звестак аб пабудове царквы можна назваць артыкул святара П.Рафаловіча, які нёс сваё служэнне ў мястэчку Ружаны. Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі аб асвячэнні новапабудаванай царквы Раства

Прасвятой Багародзіцы ў в.Міжэвічы. Аб гэтым ён напісаў у артыкуле “Штосьці аб Міжэвіцкай царкве”, які быў надрукаваны ў літоўскіх епархіяльных ведамасцях у 1864 г. [3]. Гэты артыкул меў наступны змест: “1864 года 9-га мая, у дзень перанясення мошчаў святога Мікалая” здзейснена асвячэнне новапабудаванай драўлянай царквы ў в. Міжэвічы…. 7-га мая я атрымаў запрашэнне “на асвячэнне новапабудаванага храма ў гонар Смаленскай іконы Божай Маці”. Дзень быў цудоўны майскі. Каля царквы было шмат народу, развяваліся харугвы, якія былі прынесены з трох суседніх цэркваў.

Я спяшаўся ўвайсці ў царкву, дзе павінен быў стаць на калені перад размешчаным над дзвярыма ў колападобнай рамцы са спісам іконы Божай Маці Смаленскай, над якім быў надпіс “Здть вселюся, якоже изволихъ” [3, 28].

На працягу 220 гадоў ікона, якая па жаданні Самой Божай Маці абрала тут, у нашай мясцовасці, сваё месца, пачала называцца Міжэвіцкай. Пад такім найменнем яна ўнесена ў Беларускі Праваслаўны каляндар [4].

Урачыстым было асвячэнне гэтай царквы. Настаяцель Жыровіцкага манастыра архімандрыт Мікалай з 4 іерэямі, якія саслужылі яму, здзейсніў асвячэнне храма, прастола, ахвяравальніка, затым была адслужана Боская літургія і малебен. Усё гэта суправаджалася ўзнёслым спяваннем царкоўнага хору, глыбокай усеагульнай павагай і ўдзячнасцю ўсіх прысутных. Пасля малебна для духавенства была наладжана трапеза ў канцылярыі Міжэвіцкай грамады.

Па просьбе ваеннага начальніка г.Слоніма міністр дзяржаўнай маёмасці асігнаваў пазыку на 6 гадоў у памеры 500 рублёў срэбрам для таго, каб канчаткова завяршыць работу ў царкве”.

Вядома, што будаўніку царквы Феліксу Філютовічу за яго працу і асаблівае старанне была прадстаўлена адпаведная ўзнагарода [3, 29].

П.Рафаловіч у сваім артыкуле “Штосьці аб Міжэвіцкай царкве” (1864 г.) расказаў паданне мясцовых жыхароў аб іконе Смаленскай Божай Маці, якое захавалася ад дзядоў. “На гэтым жа самым месцы, дзе стаяла старая царква і дзе стаіць цяпер новая, калісьці была паходная царква 80-га пяхотнага палка Расійскай імперыі часоў Екацярынінскіх. Асноўным сімвалам царквы была копія на метале іконы Смаленскай Божай Маці, якую яны шанавалі як цудадзейную. Гэты полк стаяў тут лагерам і праз нейкі час збіраўся ў дарогу. Калі ікона і паходная цэркаўка былі пакладзены ў павозку, то запрэжаныя ў яе коні не змаглі крануцца з месца. Нарэшце воіны зразумелі, што тое быў Божы знак, што сама Маці Божая абірала тут, у гэтай вёсачцы, яшчэ адзін для сябе прытулак. Магчыма,

глыбокая, шчырая вера тутэйшых жыхароў стала адной з прычын таго, што Маці Божая праз маленькую копію іконы хацела падтрымаць людзей, адвесці навалы і ліхалецці, якія неаднаразова здараліся з людзьмі” [3, 31].

Быў адслужаны акафіст Божай Маці. Затым, па меркаванні воінаў і просьбе мясцовых жыхароў, копія іконы засталася ў вёсцы.

Месцам яе ўсталявання стаў вялікі драўляны крыж, які размясцілі на тым месцы, дзе быў прастол паходнай царквы.

Самая сталая прыхаджанка царквы, Вольга Ульянаўна Казлоўская, якой у лістападзе 2014 года споўнілася 88 гадоў, расказала нам пра тое, што ўдзячныя сяляне, якія на ўласныя вочы бачылі тую з’яву, хацелі перанесці крыж з іконай крыху далей, на ўзгорак (дзе цяпер стаіць наша школа), так як у тым месцы было вельмі мокра. Але ж на наступны дзень ікона аказалася на ранейшым месцы. Сякеры не слухаліся людзей, зляталі абухі [8].

Сяляне, калі ўбачылі такое знаменне і любоў да іх Царыцы Нябеснай, сталі часта збірацца на малітву да гэтага абраза.

Крыж з іконай праіснаваў да 1800 года. А сёння наша вёска мае яшчэ два крыжы. Першы, што сустракаецца перад уваходам у нашу вёску, ды і не толькі ў нашу, – гэта крыж, пафарбаваны і ўпрыгожаны рознакаляровымі кветкамі. Ён нібы бласлаўляе на далёкую дарогу тых, хто пакідае вёску, і тых, хто вяртаецца. І больш за стагоддзе сустракае нас у пачатку “старой” вёскі маўклівы сведка гісторыі – замшэлы камень з жалезным крыжам – сімвал веры мясцовага насельніцтва ў тое, што ён – свяшчэнны абярэг ад усіх цяжкіх наступстваў. Хаты, яго равесніцы, даўно пакасіліся,ураслі ў зямлю.

Мясцовы краязнаўца – Галіна Іванаўна Лабар, успамінае: ”Калісьці жыў у вёсцы Платон Лабар (канец XIX – пачатак XX ст.). Ён ездзіў на заробкі ў далёкую Расію. Вясною 1911года вярнуўся ў родную вёску. Шмат перажыў на чужыне. У знак таго, што вярнуўся дахаты жывы і здаровы, а, па яго глыбокім меркаванні, гэта здарылася толькі па міласці Божай, вырашыў паставіць памятны крыж. З дапамогай аднавяскоўцаў на падводзе з поля быў прывезены вялікі камень – 1,5 м. вышынёй – і ўсталяваны ў пачатку вуліцы (Дадатак 1). Мясцовы каваль зрабіў жалезны крыж, які быў устаноўлены на камень. Тут жа была змешчана невялікая шыльдачка, на якой можна было прачытаць наступнае:

Сохрани нас Господи
Твоею благодатью
Отъ всякихъ бедъ
скорбей и напастей

Село Мижевичи
Память Платона Лабора
1911г. Іюня 1 дня [6].

У 1800 годзе на сабраныя сялянамі грошы была пабудавана і асвечана царква.

Людзі былі перакананы ў тым, што абраз Божай Маці сам Бог паслаў для пазбаўлення іх ад розных наступстваў, бо, пакуль яго не было, часта наведваліся голад, пажары, хваробы на людзях і свойскай жывёле. З гэтага часу ў вёсцы не было ніводнага пажару і, акрамя халеры ў 1855 годзе (такая была паўсюдна), ні адной павальнай хваробы ні на людзях, ні на свойскай жывёле не было.”

Жыхары вёскі, захоўваючы ў памяці падзеі з’яўлення копіі іконы Смаленскай Божай Маці, перадаючы глыбіню сваіх пачуццяў і перажыванняў сваім дзецям, збіралі сродкі на пабудову новай царквы, так як раней узведзеная царква была невялікая, яна не магла ўмяшчаць нават і трэць вернікаў. Наступіў 1864 год. Сярод жыхароў навакольных вёсак усё часцей і часцей хадзіла думка, што хутка ў вёсцы Міжэвічы, якая ў той час была прылічана да Паравалоцкай царквы Косаўскага благачыння, адбудзецца асвячэнне новай царквы ў гонар нараджэння Прасвятой Багародзіцы [8].

Н.В.Казлоўская (1950 г.н.) ўспамінае: ”Нашу вёску Міжэвічы ўпрыгожвала і ўпрыгожвае царква ў гонар нараджэння Божай Маці – царква Раства Прасвятой Багародзіцы. Мясцовы званар узбіраўся на званіцу – і ажывалі царкоўныя званы. Над вёскай, над палеткамі плыў цудоўны перазвон, у вялікія святы гучаў благавест. Сэрцы стомленых калгаснікаў, пакалечаных вайной людзей напаўняліся радасцю, верай і надзеяй. Зараслі акопы і варонкі. Жыццё брала сваё. Лугі зелянелі травой. А кветак расло такое мноства, што луг быў падобны на дыван” [8].

У 2000 годзе пры актыўным удзеле царквы адбылося перазахоўванне астанкаў 22 воінаў, якія аддалі свае жыцці ў барацьбе з фашыстамі за свабоду нашай краіны. Агні 22 свечачак трымцелі тады ў руках вяскоўцаў у памяць аб загінуўшых. А чырвоныя цюльпаны палалі і будуць палаць кожны год у Дзень Перамогі ў памяць аб усіх абаронцах.

З пачаткам трэцяга тысячагоддзя пачаўся новы этап суіснавання насельнікаў Міжэвіч і царквы. З 2005 г. па 2015 г. настаяцелем храма быў а.Дзмітрый Сёмуха. Сціплы, адукаваны, шчыры, добразычлівы, ветлівы, выклікаў глыбокі давер і павагу, з’яўляўся яскравым прыкладам служэння Богу. Многія студэнты, якія праходзілі практыку ў а.Дзмітрыя, ужо

з'яўляюцца настаяцелямі храмаў і нясуць паслушэнства ў розных гарадах Беларусі.

Частымі наведвальнікамі царквы былі сябры а.Дзмітрыя: Міхаіл Дзенісенка – протаіерэй Каафедральнага сабора г.Брэста, Мікалай Лабунько – настаяцель Свята-Георгіеўскага храма г.Нясвіжа, протадзьякан Свята-Троіцкага храма г.Слоніма – Генадзь Малееў, Аляксандр Раманчук – протаіерэй, выкладчык Мінскай духоўнай акадэміі і семінарыі і іншыя. Яны разам з а. Дзмітрыем праводзілі службу ў храме.

Царкву не адзін раз наведвалі журналісты Беларускага радыё. Ганаровымі гасцямі былі пасол Беларусі ў Казахстане Нічкасаў Анатоль Іванавіч, пасол Беларусі ў Польшчы – Авяр'янаў Аляксандр Казіміравіч. Заўсёды, калі бывае ў Слоніме, царкву наведвае наш знакаміты зямляк Іван Ціхан. Мы вельмі ўдзячны яму за тое, што ў яго знаходзіцца жаданне і час на зносіны з наведвальнікамі Нядзельнай школы і вучнямі мясцовай сярэдняй школы. І завяршаюцца гэтыя зносіны сумесным наведваннем царквы. Лепшым помнікам аб сустрэчах са знакамітым спарцменам стаў закладзены фруктовы сад на тэрыторыі царквы (Дадатак 2). Як заўсёды, побач былі і настаўнікі, і бацькі. Дарэчы, Іван Ціхан лічыць сваім духоўным настаўнікам а.Дзмітрыя.

А. Дзмітрый шмат зрабіў не толькі для таго, каб правесці капітальны рамонт, а і для таго, каб у царкву пачалі хадзіць маладыя сем'і. Для дзяцей прыхода была адкрыта Нядзельная праваслаўная школа, якая месціцца тут жа, каля царквы, і існуе ўжо 4 гады. Заняткі праводзяць студэнты Мінскай духоўнай семінарыі.

З 2015 года справу а.Дзмітрыя прадаўжае а.Мікалай (Шчаюк). Ён нясе слова Божае ў кожнае сэрца, якое імкнецца да спасціжэння ісціны яго зямнога існавання. Царква папаўняецца новымі вернікамі. Узнёсласць малітваў, кранальнае гучанне цудоўных песняспеваў дапамагаюць людзям ачышчаць загрубелыя душы.

Наш святар заўсёды прыходзіць на дапамогу: умее падтрымаць у хвіліны роспачы, суму, бяды, хваробы. Яму вельмі падабаецца дзяліцца з намі радасцю.

У а.Мікалая ёсць цвёрдая ўпэўненасць у тым, што “сумесныя намаганні царквы і школы фарміруюць асобу, якая на выхадзе са сцен навучальнай установы мае маральныя арыенціры, падрыхтавана да жыцця. Калі дзеці стаяць перад выбарам дабра і зла, то яны ведаюць, што такое грэх” [7].

Царква Раства Прасвятой Багародзіцы ўваходзіць у маршрут, прапанаваны Брацтвам у гонар Віленскіх мучанікаў Антонія Іаана і Еўстафія, пры Свята-Петрапаўлаўскім саборы, які знаходзіцца ў Мінску.

У красавіку 2014 года ад нашага храма быў арганізаваны хрэсны ход, прысвечаны 30-годдзю ўстанаўлення Сабору беларускіх святых (1984год).

Члены Брацтва прысутнічалі на Боскай літургіі ў гонар 150-годдзя заснавання храма ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы. У час богаслужэння да вернікаў і ганаровых гасцей далучыліся паломнікі з Мінска (Дадатак 3).

За сумленную працу па добраўпарадкаванні храма архіерэем Навагрудскай епархіі былі адзначаны медалямі прыпадобнага Елісея Лаўрышэскага прыхаджане, у тым ліку Галіна Іванаўна Лабар [5].

Побач з царквой у гонар нараджэння Прасвятой Багародзіцы знаходзіцца яшчэ адзін храм у гонар іконы “Жываносная крыніца”.

У 1993 годзе па ініцыятыве а. Віктара (Бакаўца) пачалося будаўніцтва новай царквы на тым месцы, дзе калісьці непадалёку была крыніца з празрыстай студзёнай вадой (Дадатак 4).

Недалёка ад уваходу ў царкву ёсць вялікі камень. З ім звязана рэальная гісторыя ў жыцці а. Віктара. Яму калісьці, яшчэ ў дзяцінстве, прысніўся сон… Вось ён каля царквы, чуцён меладычны звон, а на камені сядзіць сама Маці Божая і звяртаецца да хлопчыка: ”Ведаеш, табе наканавана будзе праз гады несці тут пастырскае служэнне. Ты станеш святаром.” І прайшоўшы шляхам розных жыццёвых выпрабаванняў, Віктар сапраўды стаў ім.

На Вадохрышча каля крыніцы адслужваўся малебен, асвячалася вада, якую набіраў мясцовы люд, верачы ў яе гаючую сілу. З цягам часу, у выніку асушэння навакольных прырэчных ваколіц, крыніца станавілася ўсё слабейшай. Калі а. Віктар пачаў сваё пастырскае служэнне ў родным прыходзе (ён тут нарадзіўся), то на месцы былой крыніцы быў выкапаны калодзеж. Паступова пачалося ўзвядзенне храма. Працавалі мужчыны, спрытна, ахвотна завіхаліся жанчыны. З гонарам адзначаем, што самы актыўны ўдзел у будаўніцтве царквы прымаў наш настаўнік працы – Алег Васільевіч Лысуха. Неўзабаве былі ўзведзены сцены, завершаны дах, над якім узнёсся крыж, як сімвал веры (Дадатак 4).

І вось у 1994 годзе новая царква прыняла сваіх вернікаў у лона Божай міласці і благадаці.

Кожны год у пятніцу Светлай Сядміцы ў храмах, якія пабудаваны ў гонар гэтай іконы, адбываюцца адпаведныя богаслужэнні, а таксама асвячаецца вада. Каля нашай царквы намаганнямі а. Дзмітрыя (Сёмухі)

ранейшы калодзеж набыў новыя рысы. Адмысловае аздабленне падкрэслівае яго сакральнае прызначэнне. Гэта можна бачыць на фотаздымку (Дадатак 4).

А калі вы заходзіце ў храм, то на аналоі бачыце ікону “Жываносная крыніца”. На ёй адлюстраваны ўсе тыя моманты ацалення вернікаў, якія звяртаюцца да Божай Маці са шчырай малітвай і верай у яе жыватворную сілу.

У час правядзення экскурсіі па тэрыторыі царквы мы будзем расказваць вельмі цікавую гісторыю іконы “Жываносная крыніца” і дзіўныя паданні аб іншых жыватворных крыніцах, якія затым станавіліся асновай іканапісных абразоў.

Царква ў гонар іконы “Жываносная крыніца” ў 2014 годзе адзначыла сваё 20-годдзе. Цяпер яна выкарыстоўваецца як святое месца, дзе адбываецца хрышчэнне дзетак.

Дзеля ацалення ад нашых шматлікіх немачаў зусім не абавязкова ехаць у далёкі Іерусалім, шукаць там купальню каля Авечых варот. Трэба ісці ў храм , і не на край свету, не ў суседні раён, а ў тую царкву, якая бліжэй за ўсё да нашай хаты.

**1.2. Царква Раства Прасвятой Багародзіцы – культурна-гістарычная каштоўнасць**

“Архітэктура храмаў, як ніводны іншы помнік мастацтва, нясе ў сабе адбітак духоўнай спадчыны нацыі, сведчыць аб невычэрпным таленце, эстэтычным мысленні народа.

У храмабудаўніцтве, якое сінтэзавала архітэктуру, жывапіс і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, народ увасабляе свае лепшыя ідэалы і пачуцці, выяўляе разнастайнасць мастацка-стылявых асаблівасцей, якія характэрны выключна для Беларусі. У дрэва і цэглу дойліды ўкладалі характар, веліч і непаўторнасць беларускай душы, што надало яскравую адметнасць праваслаўнаму дойлідству Беларусі”, – піша ва ўступным слове да энцыклапедычнага даведніка “Праваслаўныя храмы на Беларусі” А.М.Кулагін [2].

Нам вельмі прыемна адзначыць, што царква Раства Прасвятой Багародзіцы ўпамінаецца ў энцыклапедычным даведніку “Праваслаўныя храмы на Беларусі” як адзін з помнікаў царкоўнага дойлідства, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай архітэктуры (Дадатак 5). Царква Раства Прасвятой Багародзіцы – помнік народнага драўлянага дойлідства XIX стагоддзя [2,128]. Двухзрубная пабудова: прмавугольны ў плане асноўны аб’ём з трохграннай апсідай і прытвор з двух’яруснай чацверыковай званіцай, завершанай цыбулепадобнай галоўкай. Асноўны аб’ём накрыты двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай. Фасады рытмічна падзелены слупамі-сцяжкамі, арачнымі аконнымі праёмамі ў простых ліштвах.

Мастацка-дэкаратыўны акцэнт інтэр’ера – драўляны іканастас. Маецца фератрон пачатку XIX ст. ”Маці Божая балезная” і “Георгій Пераможца”, абраз “Пакроў” (2-я пал. XIX ст.).

Перад царквой пастаўлена драўляная двух’ярусная брама-званіца каркаснай канструкцыі. Агульныя дэталі дэкору (арачныя праёмы, шалёўка сцен) аб’ядноўваюць яе з царквой у адзіны архітэктурны ансамбль.

Як толькі мы робім першыя крокі па прыступцы да прытвору, адразу ж ахоплівае нейкае своеасаблівае трапяткое пачуццё, адчуванне таго, што па гэтых каменных плітах прайшло шмат людзей, якія імкнуліся да Бога, да яго літасці, спагады, міласэрнасці. Неслі цяжар сваіх грахоў, каб праз пакаянне і малітву ўмацаваць сваю веру, дакрануцца да яе вытокаў, адчуць Благадаць Усявышняга.

Адчыняюцца груваcткія драўляныя дзверы. Прытвора. Людзі ўздымаюць вочы і над дзвярыма бачаць надпіс, які адразу ж выклікае пачуццё сакральнасці месца, куды ты прыйшоў.

Пры ўваходзе ў храм адразу ж звяртаецца ўвага на святая святых – алтар, яго мастацка-дэкаратыўнае афармленне. У нашым храме ён – двух’ярусны (Дадатак 5).

У алтар вядуць трое дзвярэй: царскія врата, паўночныя і паўднёвыя дзверы. Царскія врата з’яўляюцца яскравым узорам тэхнікі разьбянога мастацтва.

У царкве  знаходзіцца ікона, на якой выявы прарока Ісаака і Анёла, якія адводзіць руку Аўраама з нажом. Гэта прароцкі сімвал. За ўсю шматгадовую гісторыю царквы Гасподзь адводзіў ад яе беды, і храм ні разу не закрываўся. У перыяд татальнага бязбожжа ў акрузе ўсе храмы былі разбураны, а наша царква выстаяла насуперак усім напасцям.

“Дзіўныя шляхі Гасподні, нябачныя яго крокі, але ж як відавочны яго Промысел. Дзякуючы гэтаму з’явіўся ў нашым храме абраз Прасвятой Маці Смаленскай”, – так гаворыць а. Дзмітрый аб галоўнай святыні царквы. Цяпер яна знаходзіцца ў  прыгожым новым кіёце. Да яе падыходзяць вернікі, каб памаліцца перад святым абразам Царыцы нашай Нябеснай. Калі вы наведаеце наш храм, то абавязкова падыдзіце да гэтай іконы (Дадатак 6). Яе цяжка апісаць словамі – яны здаюцца пустымі перад тым поглядам, які накіраваны на вас. У ім усё: жыццё і смерць, уваскрэсенне, вечнасць і бессмяротнасць… Погляд Багародзіцы – жывы, зменлівы. Ён адклікаецца на тое, з якім пачуццём вы падыходзіце да Яе. Яе погляд накіраваны проста на таго, хто схіляецца ў паклоне.

І вось, падышоўшы блізка-блізка, Ёй патрэбна сказаць аб сваім не хутка, а павольна-павольна, ціха-ціха, гледзячы Ёй у вочы. Сказаць сэрцам, з надзеяй, з дзіцячай верай, што Яна пачуе. І першае, што атрымае кожны, хто шчыра спадзяецца на Яе, будзе мір і цішыня, глыбокі супакой душы.

Калі мы ўспамінаем пра нашу ікону Смаленскай Божай Маці, нам адразу прыгадваецца ікона Маці Божай Жыровіцкай, такая самая маленькая, што можа ўмясціцца на далоні. Мроіцца, што гэта нейкі знак, што наша гаротная зямля невыпадкова абрана Маці Божай, што ўсе ліхалецці ўжо засталіся ў мінулым.

Якой жа нечаканасцю для нас стала адкрыццё, дзякуючы прыватнаму архіву Галіны Іванаўны Лабар, што ў храме ўтрымліваюцца іконы з моманту пабудовы царквы і прывезены яны з Расіі. Пісаў іх вучань Сымона Ушакова – Дзмітрый Цітоў. Пісаў, як гавораць знаўцы іканапісу, “добрым письмом». Толькі ікон ім было напісана больш за 434, з іх Спаса – больш за 109, Уладзімірскай Божай Маці – больш за 162. Вядома, што іканапісец працаваў з 1682 па 1703 год. Гэта дае магчымасць меркаваць, што ў царкве знаходзяцца іконы, якія былі напісаны ў канцы XVII –

пачатку XVIII ст. Іншымі словамі, іконы, якія знаходзяцца ў царкве, з’яўляюцца сапраўднай культурна-гістарычнай каштоўнасцю.

У храме за 150 гадоў яго існавання назапашана значная колькасць ікон, але справа не ў гэтым, а ў тым, каб прыхаджане захоўвалі памяць аб усіх падзеях, якія адбываліся тут, шанавалі гэтую святыню і напаўнялі яе новым зместам, новым уздымам. У час правядзення экскурсіі па тэрыторыі цэркваў мы будзем расказваць пра цікавейшую гісторыю з’яўлення першага абраза Прасвятой Маці Смаленскай і гісторыю іншых ікон, якія знаходзяцца ў царкве.

Царкву ў гонар іконы “Жыванosная крыніца” сёння мы не можам назваць культурна-гістарычнай каштоўнасцю з навуковага пункту погляду, бо яна вельмі “маладая”, пабудавана сучаснымі метадамі, не мае нейкіх адмысловых мастацкіх упрыгожанняў. Але, мы цвёрда ўпэўнены, пройдзе час, і для нашых нашчадкаў яна абавязкова стане культурна-гістарычнай каштоўнасцю. А для нас яна і сёння – вялікая каштоўнасць. Будавалі ж яе нашы родныя і добра знаёмыя людзі, многія з нас менавіта ў ёй шукаюць паратунку і дапамогі, і ўвогуле, мы не ўяўляем сваёй вёскі без яе [4].

І, канешне ж, мы не можам не лічыць культурна-гістарычнай каштоўнасцю замшэлы камень з жалезным крыжам – сімвал веры мясцовага насельніцтва ў тое, што ён – свяшчэнны абярэг ад усіх цяжкіх наступстваў.

Такім чынам, мы вызначылі тры святыні, пра якія шмат ведаем, шануем іх, не ўяўляем без іх свайго жыцця і лічым іх каштоўнай культурна-гістарычнай спадчынай.

**1.3. Уплыў святыні на жыхароў вёскі**

Яшчэ ў самым пачатку работы над нашым даследаваннем ніхто не сумняваўся ў тым, што нашы святыні аказваюць на нас самы дабратворны, станоўчы ўплыў. Але работа даследчая, і мы пачалі думаць, як знайсці гэтаму доказы. Перш за ўсё мы вырашылі лепш пазнаёміцца з прадметам нашага даследвання. Прыступіўшы да вывучэння нашых святыняў, мы зразумелі, што гаварыць аб іх у адрыве ад тых, дзякуючы каму яны з'явіліся, – ад жыхароў вёскі, і самой вёскі – проста немагчыма. Хацелася б адзначыць, што галоўную ролю ў будаўніцтве культурна-духоўных помнікаў наваколля вёскі Міжэвічы адыграла жаданне людзей мець сваю святыню. Мы лічым, што ў нашай рабоце вельмі красамоўна прасочваецца непарыўнасць сувязяў і ўзаемадзеянняў грамадскага жыцця і царквы – крыніцы духоўнасці.

Такім чынам, ужо ў першай частцы нашай работы вызначылася жыццёвая патрэбнасць і неабходнасць з'яўлення святынь у Міжэвічах для ўсіх жыхароў вёскі. Гэта можа азначаць толькі адно: святыні нясуць свет, дабро, прыгажосць. Але што пра гэта думаюць аднавяскоўцы? Вызначыць гэта вырашылі пры дапамозе анкеты.

Мы правялі анкету для вучняў "Жыццё побач са Святыняй" і праналізавалі яе (Дадатак 7).

У анкетаванні прымала ўдзел 41 чалавек, вучні 5 – 11 класаў. Усе напісалі, што вераць у Бога. 98% апытаных вераць, што ў іх ёсць нябесны заступнік.

Нельга без хвалявання чытаць пра прыклады дапамогі нябесных заступнікаў. Вось некаторыя: "Калі мая мама сварылася з татам, я проста папрасіла перад іконай, і яны супакоіліся"; "Пасля прычашчэння думкі сталі святлейшымі і жыццё наладзілася"; "Мая бабуля была ў бальніцы і хутка вылечылася. Я лічу, што Маці Божая дапамагла маёй бабулі"; "Я заўсёды атрымліваю дапамогу ў час спаборніцтваў"; "Мой анёл дапамог мне, калі я хацела заняць другое месца ў алімпіадзе. І я заняла другое месца"; "Прасіла анёла, каб не заняць ніжэй за трэцяе месца ў алімпіядзе. І заняла трэцяе месца"; "Я вельмі хацела атрымаць дзевяць, і Бог мне дапамог!".

Усе пішуць пра тое, што вера станоўча ўплывае на іх думкі, паводзіны. Вось некалькі прыкладаў. "Мае паводзіны сталі лепшыя"; "Я стаў лепш вучыцца"; "Я стала лепшай. У мяне змяніўся характар"; "Думкі сталі лепшыя"; "Я ўжо магу дапамагаць старым людзям"; Я стала па-іншаму адносіцца да другіх людзей".

На пытанне, як увасабляецца ваша вера ў канкрэтных дзеяннях, былі наступныя адказы: ”А я хаджу ў касцёл, і Бог мне дапамагае”. “Я заўсёды дапамагаю, калі мяне папросяць”; “Готовлю в Воскресной школе”; “Калі просяць, назіраю за суседскімі дзецьмі”.

Ніхто з апытаных не верыць у Бога фанатычна, і нікому вера не перашкаджае ў зносінах з сябрамі-атэістамі.

Было прапанавана адказаць на пытанні анкеты “Жыццё побач са Святыняй” і дарослым жыхарам вёскі (Дадатак 7). Усяго прынялі ўдзел у анкетаванні 36 чалавек. Аналіз анкеты паказаў, што 100% апытаных вераць ў Бога, наведваюць царкву, ахвотна дапамагаюць ёй (Андрэй Мухарэўскі, Мікалай Мацыновіч, Віталь Даніловіч пафарбавалі царкву і званіцу ў блакітны колер. У будынку, дзе месціцца Нядзельная школа, сіламі і сродкамі Андрэя Мухарэўскага быў усталяваны камін, каб у халоднае надвор’е дзецям было цёпла і камфортна. Прыхаджанкі-жанчыны пафарбавалі агароджу і лаўкі…) і маюць нябесных заступнікаў; адзначаюць рэлігійныя святы, выконваюць рэлігійныя абрады. 80 % – вераць у дапамогу вышэйшых сіл пры ўмове наведвання храма. 48% не прытрымліваюцца пастоў увогуле, 36% – напісалі: “стараемся”, “не заўсёды”, “толькі ў ассобныя дні”, 16% – посцяць.

100% апытаных адказалі, што адчуваюць на сабе добры ўплыў царквы. Нельга не прывесці ў якасці доказаў наступныя меркаванні: “Я шукала адказы на многія жыццёвыя пытанні і знайшла іх. Навучылася дараваць усім, хто мяне пакрыўдзіў, стала больш міласэрнай;” “Добрыя і шчырыя словы святароў робяць такімі і нас”; “Стала з паразуменнем адносіцца да недахопаў іншых”. Усе аднадушна лічаць, што царква дапамагае ў выхаванні падрастаючага пакалення: “Дапамагае, асабліва ў тым выпадку, калі бацькі таксама неабыякавыя да царквы. Іх дзеці больш міласэрныя”; “Дапамагае, але толькі тым, хто сам гэтага хоча”; “Вучні, якія наведваюць царкву, выдзяляюцца лепшымі паводзінамі”; “У вернікаў і іх дзяцей выхоўваюцца лепшыя маральныя якасці;” “Вучні, якія наведваюць царкву больш культурныя і спакойныя”; “Дапамагае, бо без Бога наша моладзь расце, як трава”.

А для трох жыхарак Міжэвіч межы нашай анкеты аказаліся вельмі вузкімі. Яны папрасілі дазволу ў вольнай форме расказаць пра свае адносіны да царквы. Нас гэта вельмі ўзрадавала, і мы з удзячнасцю пагадзіліся. Валянціна Іванаўна Рэкун – сацыяльны работнік. Яе выказванні вылiлiся ў две старонкі ўборыстага почырку. Вось невялікая вытрымка: “…Калі пачала наведваць царкву, перада мной адчыніліся дзверы ў зусім іншы свет. Прывяла ў царкву і дзвюх сваіх дачушак. Мае

дзяўчаткі ўжо чацвёрты год наведваюць Нядзельную школу. .. У сваім жыцці я перш за ўсё кіруюся адной з галоўных, на мой погляд, хрысціянскіх дабрачыннасцей – любоўю да бліжняга…”

Мы добра знаёмы з Валянцінай Іванаўнай і лічым, што менавіта гэта дапамагае ёй годна несці ўвесь цяжар абавязкаў, якія складаюць аснову сацыяльнай работы.

Таксама дзве старонкі спатрэбілася Аксане Мухарэўскай. “…Наша маладая сям’я хутка пераканалася ў тым, што не хапае чагосьці больш важнага, чым адносны дабрабыт. Мы заўважылі, што, калі займаліся працоўнымі справамі ў нядзелю ці ў святы, абавязкова адбывалася нешта негатыўнае. Аднойчы, калі я павезла да доктара хворую малодшую дачку, Андрэя, майго мужа, як бы нешта паклікала наведаць царкву. У той дзень якраз асвячалася вада… Усё так глыбока кранула сэрца мужа, што ў наступную нядзелю ўся сям’я была ў царкве… Сёння мы ўсе служым пры царкве…”

А вось Вольга Ульянаўна Казлоўская, самая сталая прыхаджанка царквы, размясціла свае ўспаміны аж на на дванаццаці старонках. “…Я стала ірваць валошкі. Ціхенька крадучыся, з жыта выйшаў да мяне воўк. Мы былі аднаго росту, дзівіліся адзін аднаму ў вочы. Я нешта казала ваўку, працягвала яму кветкі. Ён жа не зводзіў з мяне свае жоўтыя вочы, клацаў зубамі. Але анёл-ахоўнік збярог мяне. Бы нейкая сіла прымусіла воўка пакінуць мяне жыць. Жанчыны, якія гэта бачылі – здранцвелі. Яны не маглі варухнуцца ці крычаць. Бо пасля вайны ў нашай мясцовасці было многа ваўкоў. Ноччу яны дралі сцены хлявоў, каб дабрацца да хатняй жывёлы. Гаспадары маліліся аб паратунку ад гэтай бяды…” [8].

Адносіны царквы і прыхаджан – вiдавочныя.

На богаслужэннях мы заўсёды звяртаем увагу на маладых, прыгожых хлопцаў, якія шчыра моляцца. Кожны думае аб сваім, просячы ў Бога выратавання і дапамогі. Хто гэтыя маладыя хлопцы? Што прывяло іх у царкву? Як патлумачыў настаяцель храма, гэтыя маладыя людзі праходзяць рэабілітацыю ў праваслаўна-арыентаваным Цэнтры “Анастасіс”, які знаходзіцца ў в.Сасноўка. Тут атрымліваюць духоўную, псіхалагічную дапамогу і праходзяць сацыяльную адаптацыю людзі, залежныя ад алкаголю і наркотыкаў. Кожную нядзелю яны наведваюць царкву.

Нам удалося пагутарыць з кіраўніком гэтага Цэнтра – Віталем Анатольевічам Пашкевічам. Цэнтр “Анастасіс” быў заснаваны ў 2011 годзе. “Анастасіс” у перакладзе з грэцкага – “уваскрэсенне”. У Цэнтры ёсць свая гаспадарака, дзе 3 гадзіны ў дзень працуюць маладыя людзі. Астатні час яны праводзяць з духоўнымі настаўнікамі і псіхолагамі,

прадстаўнікамі РАУС, службы занятасці насельніцтва. За гады існавання Цэнтра тут прайшлі рэабілітацыю шмат людзей. Цяжка цяпер сказаць, колькі з іх канчаткова пазбавіліся ад сваёй хваробы, але тое, што большаць з іх пры першай магчымасці наведвае не толькі Цэнтр "Анастасіс", а і наш храм, гаворыць аб многім.

Вось яшчэ адзін доказ станоўчага ўплыву нашай Святыні.

Актыўны ўдзел у духоўным выхаванні школьнікаў прымае царква праз работу Нядзельнай школы, праз работу гуртка "Асновы праваслаўнай культуры". Сумесная дзейнасць царквы і школы знаходзіць працяг у добрых справах: закладка фруктовага саду на тэрыторыі царквы, уборка тэрыторыі, пасадка кветак (Дадатак 8). З радасцю адзначаем, што самы актыўны ўдзел у добрых справах прымалі вучні, якія стаялі на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх і вучні з сацыяльна небяспечных сем'яў. Іх у нас – пяць. А на дзве сям'і, якія адносяцца да ліку сацыяльна небяспечных, збіраюцца дакументы, каб зняць іх з уліку (Дадатак 9).

Калі ў 2014 годзе на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх знаходзіліся пяць вучняў школы, то з 2015 года – ніводнага.

Дзеці Нядзельнай школы на святы рыхтуюць віншавальныя праграмы, выступаюць перад прыхаджанамі з пастаноўкамі, інсцэніроўкамі.

Ніхто з жыхароў Міжэвіч ні ў вуснай размове, ні ў анкетах не выказаў нічога адмоўнага ў бок царквы або бацюшкі.

Такім чынам вынікае, што выказванні вучняў і іх бацькоў, настаўнікаў у анкеце не проста словы, а самая што ні на ёсць рэальнасць жыцця.

Якія яшчэ патрэбны доказы?

## Заключэнне

Нам вельмі добра і з вялікай цікавасцю працавалася над гэтай работай. Усё ішло надзвычай гладка. Усе, да каго мы звярталіся па дапамогу або з пытаннямі, ахвотна з намі супрацоўнічалі. Мы атрымалі шмат слушных парад. Галіна Іванаўна, якая унесла найбольшы ўклад у напісанне нашай работы, выказала гатоўнасць напісаць рэцэнзію. Крысціна – адна з актыўных нашых памочніц – адзначыла: “Я ўпэўнена ў тым, што нам дапамагае сама Смаленская Маці Божая.”

Трохі больш часу і намаганняў мы затрацілі, каб скласці пытанні да анкет. Але гэта таго каштавала. Вельмі цікавымі і часта непадобнымі былі, хаця і на адну тэму, размовы падчас запаўнення анкет. А калі мы рабілі аналіз анкет, то з вялікім задавальненнем адзначылі, што нашы думкі наконт дабратворнага ўплыву царквы на тых, хто жыве побач, поўнасцю супалі з апытваемымі.

Мы лічым, што гіпотэза: калі на самой справе вясковае жыццё побач з духоўным пачаткам – Святой царквой – станоўча ўплывае на маральны воблік людзей увогуле і падрастаючага пакалення ў прыватнасці, то гэтаму існуюць важкія доказы, поўнасцю знайшла сваё пацвярджэнне.

Мы думаем, што матэрыялы нашага даследавання знойдуць і практычнае прымяненне. Імі можна карыстацца на ўроках гісторыі, факультатыўных занятках, курсах па выбару, пазакласных мерапрыемствах.

Плануецца:

стварыць віртуальную экскурсію “Жыццё побач са Святыняй”.

падрыхтаваць артыкул аб культурна-духоўных аб’ектах вёскі і прадставіць яго для друку ў сродках масавай інфармацыі.

Вясной і летам школа патанае ў квецені (Дадатак 10). І працуюць тут таленавітыя і творчыя людзі, для якіх кожнае дзіця, як зорачка, якой ні ў якім разе нельга даць згаснуць на жыццёвым шляху. І мы тут вучымся! Мы верым, што прыгажосць прыроды, прыгажосць душы, імкненне да ведаў пад аховай нашай Святыні дасць трывалы падмурак будучыні не толькі роднай вёсцы, але і ўсёй нашай краіне з прыгожай, напеўнай назвай – Беларусь. Мы выконваем запавет вядомага і любімага намі беларускага пісьменніка У.Караткевіча: “…любіце гэтую светлую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена. Ды і не патрэбна”. І мы любім!!!

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Слонімскага раёна. Мн., 2004

2. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. /А.М.Кулагін/ Мн., 2001
3. Барбажинский, Л.А. Историко-статистическое описание приходов Слонимского благочиния Новогрудской епархии. / Л.А.Барбажинский/ Жировичи,2008
4.Беларускі праваслаўны каляндар 2014г. Мн.,2013
5. Зинченко, Игорь. В Мижевичах – храмовый праздник / Игорь Зинченко / Слонімскі веснік - № 51-52, 2014
6. Лабар, Г.І. Сямейны архіў /Г.І.Лабар. /
7. Інтэрв'ю з а. Дзмітрыем, протаіерэем царквы Раства Прасвятой Багародзіцы.
8. Гутаркі з мясцовымі жыхарамі:
мясцовы краязнаўца - Г.І.Лабар;
Л.А.Барбажынскі, настаяцель Перавалоцкага прыхода;
Н.В.Казлоўская (65гадоў).